Копія

# РЭСПУБЛІКА

выданьне аргкамітэту Дэмакратычнае Партыі Беларусі №1

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/11 sprava 8-96

ПРАЕКТ

## СТАТУТ

ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ БЕЛАРУСІ - палітычная арганізацыя.

Партыя дзейнічае на падставе Дэкляраццыі Правоў Чалавека і дамагаецца ўстанаўленьня дэмакратычнае ўлады, забесьпячэньня правоў чалавека і грамадзяніна, стварэньня рознаўкладнае і канкурэнтназдольнае эканомікі рэспублікі, дэідэалягізацыі дзяржаўных інстытутаў, гаспадаркі і адукацыі.

Партыя лічыць адзіным шляхам разьвіцьця краіны ўтварэньне незалежнае Беларускае Рэспублікі.

### І. АРГАНІЗАЦЫЯ.

І.І. Вышэйшым органам партыі зьяўляецца Канфэрэнцыя, якая склікаецца не радзей аднаго разу ў год па рашэньню праўленьня або калі за гэта выкажацца ня менш аднае чвэрці членаў партыі; парадак прадстаўніцтва, месца і час канфэрэнцыі вызначае праўленьне, павестка дня рыхтуецца праз ініцыятараў і зацьвярджаецца канфэрэнцыяй.

І.2. Канфэрэнцыя прымае рашэньні аб утварэньні партыі, прыняцьці Статута і іншых дакумэнтаў або папраўак да іх, абірае кіруючыя органы і зацьвярджае іх справаздачы.

І.3. Канфэрэнцыя не мае права на роспуск партыі, а можа абвясьціць агульнапартыйны рэфэрэндум - партыя распускаецца або мяняе назву, калі за гэта выкажацца ня менш 9/І0 яе членаў.

### ПРАЎЛЕНЬНЕ.

І.4. Праўленьне кіруе дзейнасьцю партыі паміж канфэрэнцыямі, на якіх абіраецца простай большасьцю галасоў ня менш як на адзін год, парадак галасаваньня вызначае канфэрэнцыя.

І.5. Дзейнасьць праўленьня абмяжоўваецца толькі Статутам і рашэньнямі канфэрэнцыі.

І.6. Члены праўленьня роўныя ў правах і апэратыўныя рашэньні прымаюць самастойна. Пастанова праўленьня зьяўляецца афіцыйным партыйным дакумэнтам і прымаецца кваліфікаванай большасьцю або двума трэцямі галасоў.

І.7. Члены праўленьня маюць пасьведчаньні.

І.8. Члены праўленьня не атрымліваюць за сваю дзейнасьць

часовага або сталага грашовага ўзнагароджаньня.

## САКРАТАРЫЯТ.

І.9.Сакратарыят падпарадкоўваецца праўленьню.

І.10.Па рашэньню праўленьня сакратары аддзелаў, тэхнічныя і іншыя супрацоўнікі могуць атрымліваць адзінкавае, часовае або сталае грашовае ўзнагароджаньне.

І.ІІ.Сакратар аддзела абіраецца на канфэрэнцыі на адзін год структура і склад аддзела прадстаўляюцца сакратаром і зацьвярджаюцца праўленьнем.

І.І2.Аддзеламі сакратарыяту зьяўляюцца арганізацыйны, фінансавы, інфармацыйны, тэхнічны; палітычны аддзел не прадугледжаны і сакратарыят не мае права падпісваць палітычныя дакументы ад імя партыі.

## РЭВІЗІЙНАЯ КАМІСІЯ.

І.І3.Ажыцьцяўляе фінансавы кантроль на падставе Статута і рашэньняў канфэрэнцыі.

І.І4.Абіраецца на два гады, справаздачная толькі перад канфэрэнцыяй і мае права склікаць пазачарговай канфэрэнцыі, калі за гэта выкажуцца дзьве трэці членаў камісіі.

## МЯСЦОВАЯ АБО РЭГІЯНАЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ.

І.І5.Арганізацыя ўтвараецца па месцу працы або жыхарства зь ня менш як І5 членаў партыі паводле вышэй пададзенай структуры. Пры гэтым ініцыятыва ўтварэньня арганізацыі належыць да членаў партыі, але не кіраўніцтва.

І.І6.Арганізацыя мае права ў межах Статута, рашэньняў канфэрэнцыі і праўленьня прымаць рашэньні па сваім рэгіёне ці прадпрыемстве і атрымліваць цэнтралізаваную дапамогу дзеля іх выкананьня.

І.І7.Арганізацыя мае права прыёму і выключэньня, права пакідаць у сябе палову грашовых сродкаў і выкарыстоўваць іх па ўласнаму рашэньню.

І.І8.Арганізацыя рэеструецца ў аргаддзеле сакратарыяту, атрымлівае інструкцыі і парадак сувязі.

І.І9.Калі арганізацыя дзейнічае насуперак Статуту, рашэньням канфэрэнцыі або праўленьня, яна распускаецца праўленьнем, а пытаньні аб членстве ў партыі разьбіраюцца персанальна.

## ІНШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І АСОБНЫЯ ЧЛЕНЫ ПАРТЫІ.

І.20.Арганізацыі без статуса мясцовых абіраюць кіраўніка і сакратара і праз іх падтрымліваюць сувязь з аргаддзелам і і фінаддзелам сакратарыяту.

І.2І.Арганізацыі без статуса мясцовых карыстаюцца ўсімі правамі, пададзенымі ў гэтым Статуце апроч пералічаных у папярэднім разьдзеле.

І.22.Асобныя члены партыі, якія не належаць да якой небудзь арганізацыі, -са статусам мясцовай або не, -маюць дарадчы голас.

## 2.ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ЧЛЕНА ПАРТЫІ.

2.І.Член партыі павінен мець І8 гадоў, пісьмова засьведчыць, што ён абавязваецца выконваць Статут і рашэньні партыі, а таксама дапамагаць ёй з разьліку ня менш І0 рублёў у тры месяцы.

2.2.Прыём у партыю простай большасьцю галасоў ад поўнага складу арганізацыі або праўленьня партыі,рэкамендацыя і кандыдацкі тэрмін не прадугледжаныя.

2.3.За парушэньне Статута,партыйнае або фінансавае дысцыпліны член партыі выключаецца зь яе простай большасьцю галасоў ад поўнага складу арганізацыі.Вымовы ці іншыя санкцыі не прадугледжаныя.Нанова прымаць у партыю папярэдне выключаных зь яе мае права толькі канфэрэнцыя або праўленьне.

2.4.Член партыі карыстаецца правам вольнага выйсьця зь яе пасьля пісьмовай заявы,але без тлумачэньняў са свайго боку і абмеркаваньняў праз арганізацыю.

2.5.Член партыі мае права абіраць і быць абраным да любых кіраўнічых органаў.

2.6.Член партыі мае права зьвяртацца па любую асабістую дапамогу да любых партыйных органаў.

2.7.Член партыі мае партыйны білет.

## 3.АБ ПАЛІТЫЧНЫМ ПЛЮРАЛІЗЬМЕ

3.1.Член ДПБ можа належаць да прафесійных,творчых,нацыянальных і іншых непалітызаваных саюзаў,таварыстваў,суполак і аб'яднаньняў,асабістай справай члена партыі зьяўляецца яго веравызнаньне або атэістычны сьветапогляд,партыя не мяшаецца да асабістага жыцьця сваіх членаў.

3.2.Член ДПБ мае неабмежаванае права на крытыку і выказваньне поглядаў па любых праблемах,калі гэта не парушае партыйнае дысцыпліны і этыкі - перш за ўсё ў час перадвыбарчых кампаній па выбарах народных дэпутатаў Беларусі і мясцовых Саветаў.

3.3.Калі па якому-небудзь пытаньню выказалася адна пятая частка партыйных арганізацыяў,па гэтаму пытаньню праўленьне партыі абавязанае прыняць пастанову,а пры адсутнасьці кваліфікаванай большасьці - абвясьціць агульнапартыйную дыскусію і па яе выніках склікаць канфэрэнцыю ў адпаведнасьці з пунктам 1.1 гэтага Статута.

3.4.Рэдактары партыйных газэтаў адказваюць за іх зьмест самастойна і абавязаныя толькі да публікацыі афіцыйных дакументаў канфэрэнцыі,праўленьня і сакратарыяту.

3.5.Члены партыі-народныя дэпутаты маюць поўную дэпутацкую недатыкальнасьць і карыстаюцца правам вольнага голасу.Аднначасова яны прымаюць абавязак галасаваньня па найбольш важных праблемах у адпаведнасьці з рашэньнямі канфэрэнцыі і дэпутацкага корпуса ДПБ,а ў адваротным выпадку - карыстаюцца правам вольнага выйсьця з партыі.

## 4.АБ АДНОСІНАХ ДА БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ" І ІНШЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ.

4.1.Партыя шануе здабыткі і мэты БНФ"Адраджэньне" і супрацоўнічае з Беларускім Народным Фронтам на прынцыпах канфэдэрацыі - як незалежная і самастойная партыя.

4.2.Партыя не адмаўляецца ад супрацоўніцтва зь іншымі палітычнымі арганізацыямі,д з е й н а с ь ц ь якіх не супярэчыць мэтам ДПБ.

4.3.Не дапушчаецца аднначасова належаць да іншых палітычных партыяў або іх маладзёжных арганізацыяў.Пры ўступленьні да пар-

тыі член ДПБ абавязаны ...віць, зьяўляецца ён членам іншай партыі або не, і выйсьці зь ..не ў месячны тэрмін.

## 5. ФІНАНСЫ І МАЁМАСЬЦЬ.

5.1. Праўленьне партыі і мясцовыя арганізацыі маюць свае разьліковыя рахункі. Частка сродкаў можа знаходзіцца на ашчадных кніжках на імя членаў партыі, а таксама ў наяўнасьці.

5.2. Грашовыя паступлені складаюцца з дапамогі членаў партыі, ахвяраваньняў і калектыўнае дзейнасьці.

5.3. Грашовыя выдаткі ўключаюць сродкі на перадвыбарчыя кампаніі, набыцьцё неабходнае маёмасьці і гаспадарчую дзейнасьць, выплаты супрацоўнікам, бягучыя дробныя выдаткі, дапамогу членам партыі і дабрачыннасьць, прадстаўніцтва і камандзіроўкі.

5.4. Гаспадарчая дзейнасьць партыі накіроўваецца да фінансавай і тэхнічнай незалежнасьці партыі. У маёмасьці партыі могуць знаходзіцца сродкі вытворчасьці. Гаспадарчыя адзінкі партыі маюць права юрыдычнае асобы.

5.5. Фінансавай і гаспадарчай дзейнасьцю партыі кіруе праўленьне праз сакратарыят і мясцовыя арганізацыі.

## 6. ПЯЧАТКА І ЭМБЛЕМА.

6.1. На пячатцы па вакольлю надпіс "Дэмакратычная Партыя Беларусі". Унутры кола свае пячаткі азначаюць праўленьне, аддзелы сакратарыяту і мясцовыя арганізацыі.

6.2. На эмблеме партыі ў контуры Беларусі на фоне нацыянальнага бел-чырвона-белага сьцяга літары "ДПБ".

ПРАЕКТ

# ПАЛІТЫЧНАЯ РЭЗАЛЮЦЫЯ

## АБ ПАЛІТЫЧНЫМ СТАНОВІШЧЫ

На Беларусі захоўваецца рэжым камуністычнае дыктатуры.

Сягоньня рэспубліка - каланіяльная нарыхтоўчая кантора, ракетная база і "чарнобыльская зона" для досьледаў на людзях.

Арганізацыйная слабасьць апазіцыі і неакрэсьленасьць яе палітычнае плятформы прывялі да перамогі рэакцыі на выбарах, у выніку чаго ўсялякая грамадская і эканамічная дзейнасьць на Беларусі застаецца пад кантролем так званай "Камуністычнай партыі Беларусі", якая фактычна зьяўляецца тэрытарыяльнай арганізацыяй КПСС і выконвае ўсе загады "цэнтру".

Працяг антыдэмакратычнае дзейнасьці ЦК КПБ, развал і рабунак праз саюзныя міністэрствы беларускай гаспадаркі, вынішчэньне нацыянальнае культуры, ігнараваньне пытаньняў экалёгіі паказваюць, што адлучэньне ад улады камуністаў не палітычнае пытаньне, але пытаньне самога існаваньня народу.

Дэмакратычная Партыя Беларусі заяўляе аб сваёй палітычнай апазіцыі існуючаму рэжыму і заклікае да адзінства ўсе дэ-

макратычныя сілы рэспублікі.

Дэмакратычная Партыя Беларусі папярэджвае пра небясьпеку ўстанаўленьня адкрытае дыктатуры сталінскага ці фашыстоўскага тыпу праз камуністычную і мілітарную вярхушку.

АБ ЭКАНАМІЧНЫМ СТАНОВІШЧЫ ГРАМАДСТВА

У чалавека няма іншых крыніцаў існаваньня апроч розуму, працы, спадчыны продкаў і набытай маёмасьці.

Праклямуючы бязкласавае грамадства, КПСС утварыла рэжым наймацнейшай эксплуатацыі чалавека бесчалавечнай машынай таталітарызму і нарадзіла новых эксплуататараў - партыйна-дзяржаўна-мілітарны апарат зь яго аховай і прыслужнікамі.

Адвечны дэфіцыт, жабрацкія заробкі і атручаная прырода - вынік не асобных памылак асобных дзеячоў КПСС, але самае ідыялёгіі камунізму, якая вынішчае галоўны скарб любога грамадства - уласьніцкі і творчы інтарэс чалавека і недатыкальнасьць яго маёмасьці.

Эканамічная рэформа КПСС мае рабунковы напрамак, паколькі іншыя формы маёмасьці апроч дзяржаўнай дыскрымінуюцца як чыста адміністрацыйнымі метадамі так і адсутнасьцю вольнага рынку і фінансавай сістэмы.

Дэмакратычная Партыя Беларусі выступае супроць паноўнага выкупу прадпрыемстваў праз працоўныя калектывы, паколькі гэтыя калектывы рабаваліся бюракратычнай сістэмай дзесяткі гадоў, а таксама супроць прымусовага ўтварэньня "асацыяцыяў" і прымяненьня санкцыяў да "непаслухмяных" прадпрыемстваў.

Дэмакратычная Партыя Беларусі папярэджвае працоўных аб тым, што мясцовая заводская адміністрацыя, якая любіць жаліцца на міністэрства або абкам КПБ, у большасьці выпадкаў сама вельмі цесна зьвязаная з названымі ўстановамі старымі пазаслужбовымі сувязямі, а яе эканамічны інтарэс застаецца нязьменным - захаваньне аўтарытарызму кіраваньня, бяспраўя рабочых ды інжынераў, крадзеж і прыўлашчваньне паўкоштам маёмасьці, якая належыць працоўным калектывам.

Дэмакратычная Партыя Беларусі лічыць неабходным утварэньне на прадпрыемствах Рабочых Камітэтаў Самакіраваньня дзеля адлучэньня ад улады адміністрацыі, не абароняючай свайго прадпрыемства і абыякавай да яго лёсу, а таксама пазбаўленьня магчымасьці парткамаў КПБ мяшацца да любога пытаньня.

Дэмакратычная Партыя Беларусі сьцьвярджае, што без самакіраваньня і выйсьця з-пад міністэрскае сістэмы эканоміка рэспублікі ўвойдзе ў глыбокі крызіс, а працоўныя будуць пазбаўленыя элементарных умоваў цывілізаванага жыцьця.

АБ ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

Чалавек народжаны вольным і адказным толькі перад сваёй сям'ёй, сваім народам і сваімі перакананьнямі.

У выніку шматгадовага разбурэньня грамадства знаходзіцца ў апошнім становішчы - людзі ня вераць ні ўва што і нікому, пануе падвойная мараль, штучнаствораная ідыялёгія, жывёльныя імкненьні да элементарных патрэбаў, няпамяць уласнай годнасьці.

Дэмакратычная Партыя Беларусі ўважае, што прычынай такога становішча зьяўляецца прыярытэт дзяржаўных або ідыёлягічных інтарэсаў над інтарэсамі чалавека.

Здаровае грамадства не існуе пад прымусам.

Ніводная палітычная партыя,дзяржаўная ўстанова,рэлігійная абшчына,нацыянальнае таварыства ня можа мяшацца да асабістага жыцьця сваіх членаў.

Па-за спаўненьнем абавязкаў,агульнапрынятых у цывілізаваным грамадстве,чалавек вольны ў сваіх паводзінах,працы,творчасьці,гаспадарчай і іншай дзейнасьці.

Дэмакратычная Партыя Беларусі лічыць парушэньнем правоў чалавека любое абмежаваньне яго дзейнасьці праз любую дзяржаўную ўстанову,калі гэта зьвязана з ідыялегіяй,рэлігіяй або іншадумствам - незалежна ад таго,як такое абмежаваньне сфармулявана афіцыйна.

## АБ ВАЙСКОВЫМ АБАВЯЗКУ

Дэмакратычная Партыя Беларусі выступае за раззбройваньне супроцьстаячых арміяў,скарачэньне іх колькасьці і выдаткаў на ўтрыманьне ўзброеных сілаў і ваеннай прамысловасьці.

Дэмакратычная Партыя Беларусі лічыць воінскі абавязак анахранізмам і выступае за прафесійную армію,забарону вайсковых збораў без згоды рэзэрвіста ды выкарыстаньне арміі на гаспадарчых работах.

Дэмакратычная Партыя Беларусі выступае за ўводзіны альтэрнатыўнай грамадзянскай службы без зброі - неадкладна і тэрмінова.

## АБ ПРАВЕ НАРОДАЎ НА САМАВЫЗНАЧЭНЬНЕ І НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ

Дэмакратычная Партыя Беларусі ўзнае права кожнага народа на дзяржаўную незалежнасьць як адну з магчымасьцей права народаў на самавызначэньне.

Дэмакратычная Партыя Беларусі шануе рашэньне літоўскага Ураду і народу Літвы аб адраджэньні Літоўскае Рэспублікі ў цяперашніх існуючых межах,а таксама асуджвае правакацыйныя ваенныя і гаспадарчыя акцыі супроць рэспублікі.

Антылітоўскія акцыі - гэта працяг праз КПСС захопніцкае каланіяльнае палітыкі расійскага царызму.

Дэмакратычная Партыя Беларусі лічыць Вільню і віленскі край гістарычным цэнтрам і духоўным храмам нашае прабацькаўшчыны Вялікага Княства Літоўскага - калыскі абодвух народаў, літоўцаў і беларусаў.

Дэмакратычная Партыя Беларусі папярэджвае адпаведныя партыі і ўстановы ад спробаў падмяніць шанаваньне гістарычнага здабытку продкаў распальваньнем міжнацыянальнай варожасьці і правакацыяй братазабойчай вайны.

## АБ АДНОСІНАХ ДА "ДЭМАКРАТЫЧНАЕ ПЛЯТФОРМЫ" І ЯЕ ПРЫХІЛЬНІКАЎ У КПСС

Дэмакратычная Партыя Беларусі лічыць,што ўтварэньне партыйных фракцыяў у КПСС немагчыма.

Калі толькі дойдзе да спробаў арганізацыйнага афармленьня якой-небудзь апазіцыі і непазьбежнага за гэтым падзелу маёмасьці,усе "апазіцыянеры і апартуністы" будуць абавязкова выключаныя з КПСС,як дагэтуль і адбывалася неаднаразова ў гісторыі названай партыі.

Дэмакратычная Партыя Беларусі лічыць,што значная колькасьць цяперашніх камуністычных "дэмакратаў" з часам пакаецца і ўзнае артадаксальны камунізм за адзіную слушную тэорыю.

Дэмакратычная Партыя Беларусі памятае пра тое, што з прычыны вядомых усім абставінаў у сваім часе да КПСС далучылася шмат людзей "па службовай неабходнасьці" і змагаецца не супроць "фармальных" камуністаў, але супроць камуністычнае ідэалёгіі і яе закаранелых носьбітаў.

Адначасова ДПБ лічыць, што нямožна бясконца знаходзіцца ў той партыі, ідэалёгію якое не падзяляеш, таму што гэта рана ці позна канчаецца маральным вынішчэньнем чалавека.

Дэмакратычная Партыя Беларусі ня бачыць перашкодаў для прыёму ў партыю выключаных з КПСС прыхільнікаў "Дэмакратычнае Плятформы".

АБ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ СІМВАЛАХ І СЬВЯТАХ

Дэмакратычная Партыя Беларусі прымае нацыянальныя сімвалы бел-чырвона-белы сьцяг і герб Пагоня і шануе ўжываньне сімволікі нацыянальных меншасьцяў Беларусі.

Дэмакратычная Партыя Беларусі сьвяткуе Дзень Незалежнасьці 25 Сакавіка, Дзень Працы І Мая, Дзень Перамогі над фашызмам 9 Мая, Дзень Грунвальдскае бітвы 15 Ліпеня, Дзень Памінаньня Продкаў "Дзяды" 30 Кастрычніка і І Лістапада.

Дэмакратычная Партыя Беларусі шануе рэлігійныя сьвяты ўсіх веравызнаньняў на Беларусі.

ПРАЕКТ

# ЗВАРОТ ДА ГРАМАДЗЯНАЎ БЕЛАРУСІ

Дэмакратычная Партыя Беларусі заяўляе аб сваім утварэньні названым дакументам.

Дэмакратычная Партыя Беларусі цалкам падзяляе прынцыпы Усеагульнае Дэклярацыі праваў чалавека і выступае за іх рэалізацыю ў Беларускай Рэспубліцы.

Дэмакратычная Партыя Беларусі першачарговай мэтай лічыць устанаўленьне дэмакратычнага грамадзтва, для чаго лічыць неабходным пазбаўленьне ўлады Камуністычнае Партыі Беларусі.

Дэмакратычная Партыя Беларусі не ставіць задачы захопу ўлады праз сябе і ўстанаўленьня новай "дэмакратычнае дыктатуры", але выступае за шматпартыйную сістэму, распаўсюджаную без абмежаваньняў на прадпрыемствах, ва ўстановах, арганізацыях, у міліцэйскіх і вайсковых адзінках.

Дэмакратычная Партыя Беларусі лічыць падманам абяцаньні вярхушкі КПСС "установить демократию", паколькі ўжо неаднаразова заяўлялася, што камуністы не пацерпяць прысутнасьці іншых партыяў у арміі, службе бясьпекі і ў міліцыі. На справе гэта азначае, што ўзброеныя сілы СССР могуць належаць выключна да камуністаў і што камуністы разглядаюць ужываньне сілы супроць

свайго ўласнага народу як сваё сьвятое і неабмежаванае права дзеля захаваньня ўлады, якую яны называюць "светлым будущим всего человечества".

Дэмакратычная Партыя Беларусі шануе права камуністаў на палітычнае існаваньне, але выступае супроць іх манаполю і за канфіскацыю дзяржавай усяе маёмасьці КПСС, набытай у асноўным рабункам і прыўлашчваньнем.

Дэмакратычная Партыя Беларусі выступае за рознаўкладную і канкурэнтаздольную эканоміку, умовай існаваньня якой можа быць не датацыя, але ўласны зыск, зароблены на забесьпячэньні патрэбаў чалавека.

Дэмакратычная Партыя Беларусі разумее рэалізацыю правоў чалавека як вольнасьць яго ў сваіх прынцыпах, паводзінах, працы і творчасьці, калі гэта не супярэчыць прынцыпам цывілізаванага грамадзтва. Адначасова партыя лічыць злачынствам зьнявагу, перасьледаваньні, звальненьні і іншыя дзеяньні супроць асобы, калі гэта зьвязанае зь яго ідэйнымі перакананьнямі.

Дэмакратычная Партыя Беларусі не мае зброі і ўзброеных або мілітарызаваных фармаваньняў.

Дэмакратычная Партыя Беларусі выступае за супрацоўніцтва з усімі палітычнымі сіламі рэспублікі, якія падзяляюць прынцыпы ДПБ і выступаюць супроць таталітарнае формы праўленьня.

Дэмакратычная Партыя Беларусі разглядае рэспубліку як гістарычнае скрыжаваньне Эўропы і бачыць выгоды яе жыхароў у супрацоўніцтве і гандлю з Усходам і Захадам, Поўначчу і Поўднем - з усімі краінамі незалежна ад іх палітычнага ладу.

Дэмакратычная Партыя Беларусі выступае супроць любой дэпартацыі жыхароў рэспублікі за яе межы - сягоньня і назаўжды.

Дэмакратычная Партыя Беларусі лічыць незалежнасьць Беларускай Рэспублікі адзіным шляхам выжываньня беларусаў, палякаў, рускіх і другіх народаў нашай зямлі ды стварэньня кожнаму чалавеку годных яго ўмоваў жыцьця.

За нашу і вашу вольнасьць!

Жыве Беларусь!

## Ад Аргкамітэту

Зь вядомых прычынаў Аргкамітэт ня мае памяшканьня і сталага адрасу. Заявы і складкі просім дасылаць па адрасу: 230026 БССР, Гродно, бульвар 60-летия Октября, д.61, кв.172, Дмитриев Виктор Николаевич, тэл. у працы 44-32-41.

Карэспандэнцыю да рэдакцыі газэты "Рэспубліка" Вы можаце перадаць праз музей М. Багдановіча ў Гародні па вул. І Мая, 10.

Погляды аўтараў артыкулаў неабавязкова адпавядаюць поглядам рэдакцыі або арганізацыйнага камітэту.



Цана 50 кап.